# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
18 лютага
1993 года
№ 2
(1689)


РЫВОК НАПЕРАД

## ГІСТАРЫЧНАЯ НАВУКА ПАКІДАЕ КУЛУАРЫ

*На тры дні ў пачатку лютага сабраліся на гістарычным факультэце Белдзяржуніверсітэта гісторыкі Беларусі. Упершыню яны правялі Усебеларускую канферэнцыю і прысвяцілі яе тэме «Гістарычная навука і гістарычная адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: новыя канцэпцыі і новыя падыходы». На пайтары заключныя гадзіны канферэнцыя была ператворана ў кангрэс, што дазволіла яе ўдзельнікам прыняць важныя рашэнні.*

*Галоўным вынікам форуму стала стварэнне Асацыяцыі гісторыкаў Беларусі. Яе ўзначалілі з роўнымі паўнамоцтвамі два сустаршыні: дэкан гістарычнага факультэта Пётр Аляксеевіч ШУПЛЯК і дырэктар Інстытута гісторыі Акадэміі навук Беларусі Міхаіл Паўлавіч КАСЦЮК. На заключнай прэс-канферэнцыі яны запэўнілі журналістаў, што пасля доўгага перыяду штучнага падзелу акадэмічнай і вузаўскай навукі сумеснае кіраўніцтва Асацыяцыяй гісторыкаў будзе гарантыяй ліквідацыі былых перашкод.*

*(Заканчэнне на 2-й стар.).*

У «ВЯРХАХ»

## СЁННЯ СТЫПЕНДЫЯ. ЗАЎТРА — КРЭДЫТ

**Прадстаўнікі дзяржаўных і камерцыйных ВНУ рэспублікі з 4 да 6 лютага правялі нараду-семінар пад назвай «Вышэйшая школа ва ўмовах пераходу да сацыяльна з'арыентаванай рыначнай гаспадаркі». Арганізатарам выступіла Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.**

Ішоў абмен думкамі па надзённых праблемах альмаматэр і шляхах яе далейшага развіцця. Вось некаторыя напрамкі дыскусіі: новыя падыходы да арганізацыі вучэбнага працэсу сярод кіраўніцтва ў вышэйшай школе, нацыянальная сістэма атэстацыі навукова-педагагічных кадраў; аб платнай адукацыі; аб выкананні закона «Аб мовах» у ВНУ.

Што ж чакае студэнтаў у бліжэйшы час? Наконт платнага навучання прысутнічаючыя на нарадзе прыйшлі да такой высновы: першая вышэйшая адукацыя ў дзяржаўных ВНУ павінна быць бясплатнай, астатнія — за грошы. Незвычайнай можа быць у хуткім часе стыпендыя. Міністэрства адукацыі рыхтуе прапанову ў Саўмін аб увядзенні сістэмы крэдытавання, адпаведна з якой кожны студэнт будзе мець права на атрыманне дзяржаўнага крэдыту для задавальнення сваіх жыццёвых патрэб.

Прарэктар БДУ прафесар Пётр Дзмітрыевіч Кухарчык, які ўдзельнічаў у рабоце семінара, падкрэсліў, што трэба часцей абмяркоўваць разам шматлікія праблемы навучальных устаноў.

ПРОЗА ЖЫЦЦЯ

## БАГАТЫЯ ТАКСАМА БЕДНЫЯ

*Стыпендыя — увогуле рэч патрэбная. Атрымліваючы яе, часам спадзяешся, што гэтых грошай (сёння 2400 рублёў) хопіць на ўвесь месяц — так захапляе выгляд пакункаў разліковых білетаў. Гэтае ўражанне знікае, як толькі сутыкнешся з рэаліямі паўсядзённага жыцця.*

Зойдзем, прынамсі, у студэнцкую сталоўку. Паглядзеўшы на цэннік, адразу задаешся пытаннем: а можа, есці і не хочацца? Лёгкі, вегетарыянскі абед абыйдзецца не менш чым у паўсотню. Больш каларыйнае харчаванне пацягне мінімум на восемьдзесят рублёў. Чаргуючы карыснае са смачным, няцяжка падлічыць, што за месяц кішэня «скуднее» мінімум на дзве тысячы. На астатнія выдаткі (снеданне і вячэра, транспарт і аплата інтэрната, парстаецца сорак «зайчыкаў».

Становішча, як бачым, цяжкае. Але выйсце з яго знайсці можна. Многія бачаць яго ў дадатковай рабоце. А тым, хто ў вольную гадзіну аддае перавагу не бізнесу, а бібліятэцы, можна параіць часцей звяртацца да кнігі Поля Брэга «Цуд-галаданне», якая дазволіць эканоміць не толькі грошы, але і здароўе.

І яшчэ адна парада: для заспакаення меней глядзіце на Захад, лепш кіньце позірк на Усход. У Пецярбургу сёння мінімальная стыпендыя складае 1800 рублёў, пры цэнах на харчаванне, якія ў 2—4 разы вышэй за нашыя. На іх фоне мы выглядаем багатымі, якія, аднак, таксама не ў стане пераадолець цяжар жабрацкага існавання.

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС
на замяшчэнне пасад:

**ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** кібернетыкі; матэматычнага забеспячэння ЭВМ;

**ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ:** педагогікі; фізікі цвёрдага цела; рускай класічнай літаратуры; беларускай мовы; новай і найноўшай гісторыі (0,5 стаўкі);

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** сусветнай і айчыннай гісторыі; педагогікі; гісторыі філасофіі і логікі; этыкі і эстэтыкі; эканамічных навук; англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў; агульнай фізікі; вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі; кібернетыкі; інтэлектуальных сістэм; матэматычнай фізікі; метадаў аптымальнага кіравання; вышэйшай матэматыкі; тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі; тэорыі функцый; лічбавых метадаў і праграміравання; функцыянальнага аналізу; батанікі; біяхіміі; геадэзіі і картаграфіі; эканамічнай геаграфіі замежных краін; радыяцыйнай хіміі; арганічнай хіміі; гісторыі Беларусі; археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін; крыніцазнаўства і музеязнаўства (музеязнаўства); гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў; методыкі выкладання рускай мовы і літаратуры; рускай мовы як замежнай; замежнай журналістыкі і літаратуры; канстытуцыйнага права; давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі моладзі;

**СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** педагогікі; англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў; фізвыхавання і спорту; матэматычнага забеспячэння ЭВМ; эканамічнай геаграфіі замежных краін; крыніцазнаўства і музеязнаўства (гістарычная інфарматыка); крыміналістыкі; тэорыі і методыкі выкладання рускай мовы як замежнай; давузаўскай падрыхтоўкі і прафарыентацыі моладзі;

**ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** англійскай мовы прыродазнаўчых факультэтаў; нямецкай мовы; фізвыхавання і спорту; філасофіі і метадалогіі навукі; гісторыі журналістыкі і літаратуры; тэорыі і практыкі сучаснай журналістыкі; тэлебачання і радыёвяшчання; беларускай літаратуры; геадэзіі і картаграфіі;

**АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** матэматычнай фізікі; матэматычнага забеспячэння САПР; тэхналогіі праграміравання; агульнай фізікі; методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі; тэарэтычнай фізікі.

Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.

Адрас: 220050, г. Мінск, пр. Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 26-59-39.

ДОШКА АБ'ЯЎ

**РЭКТАРАТ, ПРАФКОМ БЕЛДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТА ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ,** што з 1 лютага 1993 года пераносяцца тэрміновыя выплаты:

— заработнай платы асноўным супрацоўнікам універсітэта на 4, 5, 6 лічбы кожнага месяца;

— заработнай платы сумяшчальнікам, пагадзінавікам на 10, 11, 12 лічбы;

— стыпендыі замежным студэнтам на 10, 11, 12 лічбы;

— авансу на 16, 17, 18 лічбы;

— стыпендыі асноўным студэнтам на 21, 22, 23 лічбы.

## ПЯТЫ КУРС — НЕ АПОШНІ

***На хімічным факультэце трое студэнтаў афіцыйна лічацца шасцікурснікамі, нават атрымліваюць стыпендыю ад універсітэта.***

Усё гэта,- дзякуючы загаду яшчэ былога саюзнага Міністэрства адукацыі за 1988 год «Аб падрыхтоўцы кадраў з падоўжаным тэрмінам навучання».

Па словах **Тамары Пятроўны КАРАТАЕВАЙ**, намесніка дэкана па вучэбнай рабоце хімічнага факультэта, студэнты займаюцца па індывідуальных праграмах на кафедры неарганічнай хіміі. Кожны з іх мае свайго навуковага кіраўніка. Дзяржаўныя экзамены яны здавалі разам са сваімі сакурснікамі, а цяпер распрацоўваюць свае навуковыя тэмы. Надалей яны — будучыя аспіранты.

СПЯШАЙЦЕСЯ!

## Пуцёўкі ёсць

***Добра правесці час — справа не такая ўжо і лёгкая.***

У гэтым годзе з дапамогай прафкома студэнтаў турбазы, дамы адпачынку наведалі 119 чалавек, санаторыі — 3. Калі звярнуцца да аналагічных мінулагодніх паказчыкаў (101; 3) то можна сказаць: сёлета лічбы павысіліся на 17,7 працэнта. Як бачым, нават павышэнне кошту не перашкаджае студэнтам выдатна адпачываць.

Пачаліся заняткі. Але жадаючыя на пэўны час сумясціць карыснае з прыемным могуць звярнуцца ў прафком за пуцёўкамі ў прафілакторый БДУ. Кошт кожнай з іх па сённяшніх цэнах амаль смяхотны — усяго 750 рублёў.

ЮБІЛЕІ

## НА ТЫМ ЖА МЕСЦЫ

***6—7 лютага камсамольцы рэспублікі правялі злёт свайго актыву, прысвечаны гадавіне адраджэння ЛКСМБ. У невялічкую вёску пад Пінскам (дзе, дарэчы, прайшоў і аднаўленчы з'езд) з'ехаліся 39 беларускіх камсамольцаў і 10 гасцей з Украіны і Расіі.***

Як паведаміў першы сакратар гэтай арганізацыі **Сяргей ВАЗНЯК**, на злёце падводзіліся вынікі работы за мінулы год, абмяркоўваліся далейшыя планы арганізацыі. На ўрачыстым сходзе выступілі сакратары камсамольскіх арганізацый з суседніх рэспублік.

Дарэчы, на злёт павінен быў прыехаць і прадстаўнік камсамола БДУ. Па нявызначаных прычынах ён адсутнічаў.

ВЫ ЧУЛІ?

## ВЫСОКІЯ ЭНЕРГІІ МАЮЦЬ НДІ

**Пры універсітэце цяпер будзе існаваць яшчэ адзін навукова-даследчы інстытут. 1 лютага Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняў пастанову аб стварэнні Нацыянальнага навукова-вучэбнага цэнтра фізікі часціц і высокіх энергій, які будзе дзейнічаць пры Беларускім дзяржаўным універсітэце на правах навукова-даследчага інстытута (спецыялізаванай навучальнай установы і юрыдычнай асобы). Новы Цэнтр будзе займацца не толькі навуковымі даследваннямі і падрыхтоўкай спецыялістаў, але таксама арганізацыяй і ажыццяўленнем комплексу работ, якія звязаны з удзелам нашай рэспублікі ў дзейнасці Аб'яднанага інстытута ядзерных даследванняў (АІЯД).**

Беларусь стала членам АІЯД у снежні 1991 года. За перыяд, які прайшоў з таго часу, закладзены асноўныя прынцыпы планавання і фінансавання навукова-даследчых работ, што выконваюцца ў АІЯД з удзелам беларускіх вучоных. Акрамя таго, яны атрымалі магчымасць для ўваходжання ў прэстыжныя міжнародныя арганізацыі і замацаванне ў іх. Не без удзелу беларускіх прадстаўнікоў у Аб'яднаным інстытуце ядзерных даследванняў упершыню прыняты прынцып мэтавага фінансавання краінамі-удзельніцамі тых навуковых праектаў і тэм, якія найбольш іх цікавяць. Раней жа сродкі, што паступалі ад членаў АІЯД, размяркоўваліся на розныя праекты па меркаванню дырэкцыі інстытута.

У 1992 годзе 12 устаноў Беларусі падалі заяўкі на ўдзел у 20 тэмах, якія ўваходзяць у Праблемна-тэматычны план навукова-даследчых работ і міжнароднага супрацоўніцтва АІЯД, прычым у васьмі з гэтых тэм фізікі нашай рэспублікі толькі пачынаюць удзельнічаць.

3 лютага на пасяджэнні Камісіі Прэзідыума Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь па пытаннях навукова-тэхнічнага прагрэсу быў зацверджаны Каардынацыйны план навукова-даследчых работ, якія будуць выконвацца ў Аб'яднаным інстытуце ядзерных даследванняў з удзелам устаноў і арганізацый Беларусі ў 1993 годзе. Зацверджаны аб'ём фінансавання 18 мільёнаў рублёў, што ў тры разы больш, чым у мінулым годзе. Магчыма, у хуткім часе гэта лічба павялічыцца да 23 мільёнаў.

СПОРТ-ЭКСПРЭС

***На Універсіяду ў польскі горад Закапанэ паехала зборная нашай рэспублікі. У гэтым фестывалі студэнцкага спорту прымуць удзел звыш за 50 краін свету.***

На жаль, фінансавыя магчымасці перашкодзілі адпраўцы ў Польшчу паўнацэннай каманды. Прыйшлося абмежавацца лыжнікамі і біятланістамі. Наш універсітэт не мае моцных спартсменаў па гэтых відах спорту, таму магчымыя кандыдаты ў зборную засталіся дома. Асноўны ж цяжар лёг на плечы студэнтаў Акадэміі фізвыхавання, якім мы жадаем поспехаў.

* * *

Выдатна выступілі ў апошнім туры першага этапу жаночага першынства Беларусі баскетбалісткі БДУ. Яны атрымалі перамогі ва ўсіх трох сустрэчах: з Акадэміяй фізвыхавання — 75:57, з Гарызонтам-2 — 73:69, з МДПІ — 75:68. А вось першыя гульні фінальнага круга нашы дзяўчаты правялі менш удала. Яны двойчы прайгралі гродзенскім баскетбалісткам — 65:83 і 78:81, і падзялілі ачкі з гамельчанкамі — 65:92 і 69:64. Хочацца верыць, што першыя няўдачы не паўплываюць адмоўна на далейшыя выступленні студэнтак БДУ.

НАВАСЕЛЛЕ

## АБ'ЯДНАННЕ ЖУРФАКА

***Нечакана пачаўся новы семестр для студэнтаў III, IV курсаў факультэта журналістыкі. Родны будынак па вуліцы Ластоўскага (яшчэ ўчора — Свярдлова) сустрэў іх зачыненымі аўдыторыямі.***

Як хутка высветлілася, пад час вакацый іх перасялілі на Маскоўскую, дзе навучаюцца астатнія журфакаўцы.

— Гэта рашэнне наспявала ўжо даўно,— гаворыць дэкан факультэта журналістыкі **Алег Георгіевіч СЛУКА**.— Немагчыма ж наладзіць добры кантроль за навучальным працэсам, калі частка факультэта знаходзіцца ў адным месца, а другая — у іншым. Такая раскіданасць стварае нязручнасці для выкладчыкаў, якія вымушаны, прачытаўшы лекцыю ў адным будынку, дабірацца на практычныя заняткі ў другі. Да таго ж, прыгнечвае стан памяшканняў у корпусе па вуліцы Ластоўскага — патрэбны вялікі рамонт. І, урэшце, павінен жа калі-небудзь журфак стаць адзіным факультэтам!

Артыкул прафесара А. Г. Слукі мы перадрукоўваем з газеты «Советская Белоруссия», але ў аўтарскім варыянце, без скарачэнняў.

***Вышэйшая школа нашай рэспублікі ніяк не можа выйсці з грамадскай трасяніны, якая зацягнулася. Перабудова, як змена грамадскай фармацыі, затым паспешлівая пераробка вучэбных праграм, спрэчкі аб прыярытэтных арыентацыях «захад-усход», пошук ідэалу студэнта «бакалаўр-магістр», а таксама вучонага — не кандыдат, а адразу — доктар, не менш цяжкае вызначэнне нацыянальнага ўздзеяння на працэсы навуковага пошуку і вышэйшай адукацыі.***

Я МЯРКУЮ

# УНІВЕРСІТЭТ У КАЛЯСНІЦЫ ДЭМАКРАТЫЗАЦЫІ

Большасць з гэтых праблем часовыя. Многія з іх сталі пастаяннымі. Напрыклад, прырошчванне нацыянальных каштоўнасцей або вяртанне да гуманітарызацыі адукацыі. Аднак узнікаюць і новыя. Паколькі бюджэт рэспублікі не ў сілах забяспечыць вышэйшую школу, то прапануецца «ідэя» аб усеагульным платным навучанні.

Праблемы складаныя, прама звязаныя з будучым нашага народу. У сувязі з гэтым здзіўляюць часта непрафесійныя дакучлівыя дыскусіі вакол вышэйшай школы, у якіх у меншай ступені ўдзельнічаюць вузаўскія работнікі, а больш — людзі, якія кіруюцца неабгрунтаванымі жаданнямі або абстрактнымі ўяўленнямі. Таму расклад меркаванняў часцей за ўсё не адлюстроўвае сутнасці працэсаў, што адбываюцца ў навуковым асяроддзі.

Асновай для сутыкнення меркаванняў, а для многіх і яблыкам разладу, стала паняцце «нацыянальны універсітэт». Адны лічаць, што ён такім з'яўляецца з першага дня свайго існавання, бо працуе ў рэспубліцы і завецца беларускім. Другіх, і не без падстаў, гэта не задавальняе, бо ў дадзеным геаграфічным прынцыпе ледзь прагледжваецца нацыянальны змест. Трэція лічаць, што калі выкладанне вядзецца на беларускай і рускай мовах, то можна зрабіць рэзкі вывад — універсітэт не адпавядае нацыянальным інтарэсам.

Аднак якімі катэгарычнымі ні былі б ацэнкі і паспешліва-эмацыянальнымі вывады, галоўнае ў тым, што ніхто не адмаўляе: універсітэт — цэнтр нацыянальнай культуры; вышэйшая адукацыя і навука з'арыентаваны на міжнародны вопыт; грамадзянскі статус вучонага — найэфектыўнейшая вытворчая сіла; аснова развіцця універсітэта — свабода і дэмакратыя.

Усё ў спрэчках больш зводзіцца да тактыкі дасягнення гэтых параметраў. Тут хаваецца небяспека: як разам з рэзкім ростам у нацыянальных адносінах, на што трэба выдаткоўваць не толькі энергію людзей, але і велізарныя матэрыяльныя сродкі, не толькі не знізіць, але і ўзняць да еўрапейскага ўзроўню беларускі навуковы патэнцыял. Складаная і цяжкая задача, на вырашэнне якой гісторыя выдзеліла нават не час, а толькі шанц.

Не сакрэт жа, што ўскраінная арганізацыя вышэйшай адукацыі і навукі не забяспечыць суверэнітэт дзяржавы. Усё гэта ўжо ў мінулым. Але і беларуская местачковая «сярмяжнасць», да якой цягнецца пэўная частка «навукоўцаў», гэта не што іншае як наўмысны пераход з агульнай каляіны на самасційную сцежку.

Несумненнай і ўсвядомленай з'яўляецца і галоўная праблема водападзелу меркаванняў — адраджэнне беларускага моўнага асяроддзя. Ва універсітэце яна разумеецца не як ведамасная ці бутафорская кампанія, а як шырокі гістарычны працэс. Разам з пашырэннем ужывання роднай мовы павінны актывізавацца спадарожнічаючыя фактары развіцця нацыянальнай гісторыі, этыкі, грамадска-палітычнай думкі, нацыянальнай самасвядомасці, літаратуры і мастацтва.

У канкрэтных моўных адносінах вучоныя універсітэта зыходзяцца на тым сцвярджэнні, што сучасны спецыяліст павінен абавязкова дасканала валодаць беларускай, рускай і як мінімум адной з еўрапейскіх, пры несумненным прыярытэце роднай мовы, што зараз і ажыццяўляецца ў БДУ.

Іншага падыходу да вырашэння гэтай праблемы няма. А хто спрабуе імгненна, як радыё раніцай, уключыць народ у размову толькі на беларускай мове, толькі нашкодзіць справе і прасуне нас па ганебным шляху міжнацыянальных канфліктаў. Перадумовы для гэтага ёсць. Рускія, украінскія, польскія, татарскія, літоўскія, еўрапейскія і іншыя меншасці ўжо адчуваюць сябе не вельмі ўтульна пад прэсінгам заўзятых беларусізатараў. Ці патрэбны нам грамадзянскія барыкады?

Можна спыніцца хаця б на адным канкрэтным прыкладзе. У апошні час у працэс «беларусізацыі» ўцёрлася грамадска-заканадаўчая сіла, якая ўзяла на сябе функцыі адміністрацыйнага штурхальніка. Ва універсітэце яна выступае ў выглядзе працоўнай групы ад Камісіі па адукацыі, культуры і захаванню гістарычнай спадчыны Вярхоўнага Савета. Мэты яна выспавядае высакародныя: удасканаленне працэсу развіцця культуры, нацыянальнай гісторыі і вышэйшай адукацыі. На практыцы ж атрымліваецца нехлямяжнае вульгарызаванае павучанне кіраўніцтва і прафесуры вышэйшай школы.

Ужо на першай сустрэчы рэктарата з Камісіяй выявілася канфліктнае напружанне бакоў: у прадузятым і ўжо гатовым рашэнні яшчэ не членаў працоўнай групы (яны будуць зацверджаны пазней), што ва універсітэце ўсё дрэнна, і яго калектыў ледзь не ігнаруе Закон аб дзяржаўнай мове. Але асаблівае засмучэнне прысутных выклікала тое, што гэта зыходзіла ад людзей нервовых, быццам некім пакрыўджаных, якія прыйшлі не разважаць, а асуджаць.

Такім чынам, яшчэ не пачаўшы справу, Камісія фактычна дыскрэдытавала сябе і сваю ідэю. І галоўнае тут не ў дробязных дэталях, названых вышэй, і не ў тым, што ў гэтай «прадстаўнічай» Камісіі апынуліся людзі, якім нельга інспектаваць нават плот, бо яны сапсуюць справу і навядуць на яго цёмны цень. Тут жа прагледжваецца задума больш хітрамудрая, хоць і яўная ў сваёй прастаце выканання. Прагледжваецца несумненны сілавы ціск на вышэйшую школу з боку ультра-рэфарматараў, якія не маюць да яе адносін, але «добра» бачаць і разумеюць не толькі куды ісці, але і як рыхтаваць спецыялістаў.

А паколькі іх сентэнцыі аб імгненнай перабудове вісяць у паветры, не адпавядаючы рэаліям функцыяніравання вышэйшай школы, то галоўную перашкоду для сваіх рэфармацый яны ўбачылі ў прафесуры і імкнуцца адсунуць яе на другі план у эшалон прымітыўнага выканання сваіх рашэнняў.

Гэта горшы паўтор таго, што пройдзена. Зусім нядаўна вучоных рэспублікі трымалі на вельмі кароткім павадку, патрабуючы толькі ідэі, адкрыцці і сцвярджаючы: дайце распараджацца гэтым багаццем нам, а вы не выстаўляйцеся!

Або, напрыклад, увесь кіруючы састаў вышэйшай школы яшчэ зусім нядаўна больш «узгадняўся» ў так званых дырэктыўных органах, а да назначэння затым падбіралася чыноўнікамі кандыдатура са сваіх людзей. Замыкалася кола ўзнаўляючай сябе бюракратыі, якая не арганізоўвала вышэйшую адукацыю і навуку як працэс творчы, а кіравала імі як брыгадай у калгасе або будоўляй у горадзе.

Цяпер прыходзяць навучаць прафесуру іншыя прадказальнікі. Прыходзіць ва ўніверсітэт настаўнік, які трымаецца на слыху ў публікі, — дэпутат з камандай, у якой прысутнічаюць скандальны лабарант з асістэнтам і заяўляюць, што яны гатовыя «рэфармаваць універсітэт». Камічная сітуацыя!

Але адначасова і трагічная. Атрымліваецца ж, што дылетантызм прыкрываецца дзяржаўнай палітыкай, робіцца спроба ўкараніць «святыя», але непрыхільныя меркаванні за спіной калектываў ВНУ і ператварыць універсітэты ў флюгеры палітычных гульняў.

Атрымліваецца, што вышэйшая школа ў каляснiцы дэмакратызацыі з'яўляецца лішнім пасажырам і яе, каб не сышла з вернага шляху на рынак, прывучаюць выконваць каманды. Сёння ў задумах гора-рэфарматараў існуе яшчэ больш вострае пытанне: нашто наогул патрэбна старая сістэма атэстацыі кадраў? Трэба кандыдатаў навук параўнаць з магістрамі, а дактароў з кандыдатамі.

Падобная авантурная тактыка вельмі шкодная. Яна збівае з панталыку маладых людзей, абвастрае і без таго складаныя ўнутрывузаўскія сувярэчнасці, падзяляе студэнтаў і выкладчыкаў.

Ад таго, што кандыдатаў навук стануць называць дактарамі мала што памяняецца. Хіба што самалюбства іншых будзе задаволена. А вось калі скасаваць доктарскія дысертацыі сённяшняга ўзроўню, то навуцы рэспублікі будзе нанесены глыбокі ўрон. Не толькі маральны, але і навуковы. Не сакрэт, што Беларусь, дарэчы, у многім дзякуючы бюракратам-кіраўнікам, знаходзіцца амаль на апошнім месцы ў Еўропе па колькасці навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Цяпер жа новая адміністрацыя пнецца нанесці ўдар і па якасці інтэлектуальнага патэнцыялу. Сверб разбурэння перайшоў у спадчыну да вызначанага асяроддзя нашых суграмадзян. А калі іх мы дапускаем ў кіруючыя структуры, дык яны ж імкнуцца бязглуздыя ідэі ўбраць у фрак закона.

Аднак ВНУ Беларусі не гнуцца, каб дагадзіць кан'юнктурным вятрам. Гэта супярэчыць іх прыродзе, таму месцазнаходжанню, якое яны займаюць у грамадстве, і прызначэнню — дзе ідзе працэс яднання розуму навукі з пакаленнямі маладых, мэтанакіраваных у будучае.

Але наспеў час сказаць уголас аб лёсе беларускай навукі і вышэйшай адукацыі. У бліжэйшы час неабходна правесці ўсебеларускую канферэнцыю вучоных ВНУ і акадэмічных інстытутаў і абмеркаваць стратэгію развіцця адукацыі ў рэспубліцы. Яе арганізатарамі могуць стаць Савет рэктараў ВНУ, Прэзідыум Акадэміі навук, Міністэрства народнай адукацыі.

Галоўная мэта канферэнцыі — вызначыць шлях хуткага выхаду навукі і адукацыі Рэспублікі Беларусь на міжнародны ўзровень і забяспечыць эфектыўнае развіццё эканомікі і культуры. Гэта мерапрыемства дапаможа сінтэзіраваць новыя ідэі і пункты гледжання на самы шырокі спектр развіцця навукі і вышэйшай адукацыі, якасці падрыхтоўкі нацыянальных кадраў, аплаты працы студэнтаў і выкладчыкаў.

Калегі, запрашаю абмеркаваць гэтую праблему.

**А. Г. СЛУКА,**
дэкан факультэта журналістыкі,
прафесар.

РЫВОК НАПЕРАД

# ГІСТАРЫЧНАЯ НАВУКА ПАКІДАЕ КУЛУАРЫ

(Працяг. Пачатак на 1-й стар.).

На пленарным пасяджэнні, у дзесяці секцыях і за «круглым сталом» абмеркавана 75 дакладаў і больш за 110 паведамленняў па праблемах гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі, межканфесійных адносін і па пытаннях выкладання гісторыі.

Канферэнцыя-кангрэс зацвердзіла Статут Асацыяцыі гісторыкаў Беларусі, які будзе дапрацаваны з улікам паправак і дапаўненняў, якія паступілі ад дэлегатаў форуму. Яны прынялі таксама заключную Рэзалюцыю і Зварот да грамадзян Рэспублікі Беларусь у сувязі з 75-й гадавінай утварэння Беларускай народнай рэспублікі, якую заклікаюць адзначыць як усенароднае свята 25 сакавіка.

Пракаментаваць гэтую падзею мы папрасілі дэкана гістарычнага факультэта **Пятра Аляксеевіча ШУПЛЯКА:**

**— Пётр Аляксеевіч, калі было вырашана правесці канферэнцыю гісторыкаў Беларусі і чаму наогул узнікла такая ідэя?**

— Думка аб неабходнасці дыскусійнай сустрэчы гісторыкаў узнікла ў нас на гістфаку недзе год таму назад і адразу ж атрымала падтрымку ў Інстытуце гісторыі Акадэміі навук. На мой погляд, патрэба наспела, зыходзячы з двух асноўных прычын. Па-першае, у пераходны перыяд грамадства ад таталітарызму да дэмакратыі мяняюцца і магчымасці, і прызначэнне гістарычнай навукі і гістарычнай адукацыі. Бо гісторыя — не толькі павышэнне нейкай колькасці інфармацыі — гэта навука, якая прызначана дапамагчы чалавеку асэнсаваць сваю прыналежнасць і да народа, і да нацыі, зразумець месца свайго народа ў сусветным супольніцтве, а вывучыўшы тое, што было раней, і закласці будучыню.



Другая прычына звязана з распадам Савецкага Саюза. Беларусь, як і іншыя рэспублікі, крочыць цяпер па шляху самастойнага гістарычнага развіцця і павінна мець суверэнную гістарычную навуку. І на ўсеагульную гісторыю мы павінны глядзець вачыма беларусаў. Зразумела, не рэвізаваць усю гісторыю і пісаць яе занова, але расстаўляць акцэнты, зыходзячы са свайго нацыянальнага пункту гледжання. Пакуль што існуюць розныя меркаванні аб нашай гісторыі і з Усходу, і з Захаду, няма толькі самага асноўнага — уласна беларускага.

Канферэнцыя ў абставінах, што склаліся, была патрэбна для таго, каб не ў кулуарах, а на афіцыйным узроўні абмеркаваць існуючыя праблемы.

**— Вы задаволены яе вынікамі?**

— Я не ўпэўнены, што ў сённяшніх умовах пад час канферэнцыі мы маглі абраць цвёрда адзначаны накірунак дзейнасці. Галоўнае ўсё ж, што канферэнцыя кансалідавала ўсіх гісторыкаў. Як вынік, на заключным пленарным пасяджэнні мы прыйшлі да высновы аб неабходнасці мець арганізацыю гісторыкаў. Па агульнаму рашэнню апошнія паўтары гадзіны мы працавалі як кангрэс. Мне здаецца: мы мелі на гэта права, бо былі прадстаўлены ўсе рэгіёны Беларусі, усе ўстановы тым ці іншым чынам звязаныя з гістарычнай навукай: больш за 340 вучоных і выкладчыкаў гістарычных дысцыплін, архіўныя і музейныя работнікі, краязнаўцы, вайскоўцы, святары. У пасяджэннях секцый прымалі ўдзел і студэнты-гісторыкі.

**— А ці прысутнічалі нашы суайчыннікі з-за мяжы?**

— Так. З Польшчы. Былі таксама прадстаўнікі (але не суайчыннікі) з Расіі, Украіны, Германіі, Галандыі...

**— Цікава, якая справа, скажам, галандцам да беларускай гісторыі?**

— Мы іх самі запрасілі, таму што нас зацікавілі метадалагічныя падыходы галандцаў да гістарычных даследванняў. Яны многага дасягнулі ў камп'ютэрызацыі гістарычнай адукацыі, а мы толькі робім першыя крокі ў гэтым напрамку. Прынамсі, гістарычны факультэт — адзін з першых гуманітарных ва ўніверсітэце актыўна карыстаецца камп'ютэрамі ў вучэбным працэсе.

**— Створаная кангрэсам Асацыяцыя гісторыкаў Беларусі — гэта даніна модзе на грамадскія ўтварэнні ці жыццёвая неабходнасць?**

— Стрыжань для аб'яднання. Разумееце, да гэтага часу асаблівага супрацоўніцтва паміж гісторыкамі ВНУ і навукова-даследчых устаноў не назіралася. Раней НДІ займаліся сваёй справай, архівы — сваёй. А мы ж усе застаемся гісторыкамі. Толькі працуем, хто ў музеі, хто ў ВНУ, хто ў архіве.

Прыйдзецца працаваць даволі напружана: дапрацоўваць праект Статута, юрыдычна афармляць Асацыяцыю, а пасля ствараць мясцовыя арганізацыі — у абласцях, раёнах.

Накірункі дзейнасці падказвае само жыццё: няма падручнікаў, праграм, шмат «белых плям», пакінутых у нашай гісторыі.

# ПРА С. С. МАНЫКІНА — ГЕОЛАГА І ГЕОГРАФА

Сямён Сяргеевіч МАНЫКІН, вядомы беларускі вучоны, геолаг і географ, які ўнёс значны ўклад у станаўленне і развіццё беларускай геалогіі, паліналогіі і палеагеаграфіі. Ён — адзін са стваральнікаў паліналагічнай школы, арганізатар і першы кіраўнік аддзела рэгіянальнай геалогіі БелНДГРІ. Асабліва важнае значэнне маюць яго працы па стратыграфіі і паліналагічнаму абгрунтаванню дэталёвага расчлянення палеагенавых і неагенавых адкладаў.

За гады вайны ён прайшоў пешшу ад Курска да Берліна, пабачыўшы шмат гарадоў, вёсак, рэчак і азёраў, лясоў і поплаваў. Усе яны нечым былі падобныя адно да аднаго, і ў той жа час адрозніваліся — курскі чарназём і паўстэпы ад беларускай дрыгвы і лясоў, польскіх і нямецкіх ландшафтаў. Захацелася ведаць пра іх калі не ўсё, то як мага больш. Таму для вучобы быў абраны геаграфічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, дзе С. С. Маныкін актыўна ўдзельнічаў у дзейнасці студэнцкага навуковага таварыства: выступаў з дакладамі, пісаў рэфераты, зацікаўлена перапрацоўваў навуковую літаратуру (і замежную таксама, бо выдатна валодаў нямецкай мовай).

У 1951 годзе С. С. Маныкін, які атрымаў дыплом з адзнакай і кваліфікацыю географа, быў накіраваны ў Маладзечна, дзе працаваў спачатку выкладчыкам, а потым дырэктарам у Інстытуце ўдасканальвання настаўнікаў. Работа цікавая, але як забыцца на навуку? Таму ў 1952 годзе ён паступае ў аспірантуру Белдзяржуніверсітэта на кафедру геалогіі. Навуковым кіраўніком яго стаў вядомы стратыграф-мікрапалеантолаг член-карэспандэнт АН БССР, прафесар А. В. Фурсенка, які якраз у тыя гады арганізоўваў мікрапалеанталагічную лабараторыю ў Інстытуце геалагічных навук АН БССР. Сямён Сяргеевіч быў дастойным вучнем. У далейшым яго жыцці былі: абарона кандыдацкай (1956 г.) і доктарскай (1970 г.), напісанне шматлікіх апублікаваных і рукапісных работ, у тым ліку і дзвюх вядомых кніг «Трэтычныя адклады Беларусі» і «Палеаген Беларусі», кіраванне аддзелам рэгіянальнай геалогіі з моманту яго стварэння і галоўнае — пастаянная, напружаная праца, па 12—16 гадзін у суткі.

Аднойчы, вырашыўшы перакваліфікавацца з географа ў геолага, ён самастойна падрыхтаваў і здаў на працягу года экзамены па 14 дысцыплінах універсітэцкага курса. Праз дваццаць год пасля смерці С. С. Маныкін не мае дастойнай замены, таму што аб'ядноўваў у сабе высокакваліфікаванага географа і геолага, стратыграфа і паліінолага, літолага і палеографа, тэктаніста і мінеролага. Ён быў надзвычай таленавіты, але, нягледзячы на гэта, выключна працаздольны, настойлівы і ўпарты.

**В. К. ГАЛУБЦОЎ,**
загадчык сектара стратыграфіі і палеанталогіі БелНДГРІ.

## 14 ЛЮТАГА — ДЗЕНЬ ЗАКАХАНЫХ. АЛЕ ВЫ НЕ СПАЗНІЛІСЯ. ЗАКАХАЦЦА НЕ ГРЭХ І 18

ТВАР ДА ТВАРУ

# МАЛЕНЬКІЯ ГІСТОРЫІ З ЖЫЦЦЯ ЗАКАХАНЫХ

**Перш за ўсё трэба разабрацца, хто такія закаханыя.**

**Ну... Э-э-э... Так. Складана.**

**Адзінае, што я ведаю дакладна, закаханыя сапраўды адрозніваюцца ад звычайных людзей. Знешне яны такія ж. Але вось настрой у іх альбо незвычайна ўзняты, альбо наадварот — вельмі дрэнны. У любым выпадку ім жывецца лягчэй: яны не цікавяцца магазінамі. А толькі адзін адным. Дзякуючы гэтаму, закаханыя доўгі час могуць зусім не снедаць: калі ў іх добры настрой, яны проста забываюць, калі ж ім дрэнна, дык ім, наогул, не да гэтага... Вясной, летам і напачатку восені іх можна сустрэць усюды. Звычайна яны ходзяць парачкамі. Зрэдку ў адзіноце. Але і ў адзіноце закаханага можна пазнаць — па вачах.**

**Яшчэ зусім нядаўна бедныя закаханыя жылі вельмі бязрадасна: у іх не было свайго свята. Як яны выжылі ў гэты час, якія святы сабе прыдумвалі. Аб гэтым нашы маленькія гісторыі.**



**НАТАША І ІГАР:**

— Нас пазнаёміў сябар дзяцінства. Мы закахаліся з першага погляду, хаця ніколі не верылі, што такое магчыма.

**— Ці ведалі вы раней, што існуе свята закаханых?**

— Ведалі, але, на жаль, не адзначалі.

**— А ў вас было сваё свята?**

— Так, дзень шлюбу: гэту дату мы адзначаем кожны месяц.

**ІРЫНА І АЛЯКСАНДР:**

— Гэта нельга назваць каханнем першага погляду. Два гады мы вучыліся разам, але нічога не ведалі адзін аб адным. А аднойчы так атрымалася, што мы былі разам увесь дзень: ён прайшоў для нас у нейкім асабістым і незразумелым настроі. Мы былі знаёмымі незнаёмцамі, а сталі самымі неабходнымі адзін аднаму людзьмі.

**— Вы, напэўна, ведалі, што існуе свята закаханых?**

— Мы чулі, што ёсць такое свята закаханых і тых, хто жадае кахання, але...

**— ...у вас было сваё свята...**

— Не зусім так, гэта быў адзін дзень. Я вельмі добра яго памятаю. Мы павінны былі развітацца на некаторы час і менавіта тады зразумелі, якое значэнне мы маем адзін для аднаго.

**АЛЕНА І ХУСАМ:**

— Усё было вельмі проста. І галоўнае, як сведчыць мясцовы астролаг Коля Хімордзін, прадугледжана зоркамі.

**— І што вы ведалі тады аб свяце закаханых?**

— Ведалі, але ж традыцыі адзначаць яго не было. І вельмі шкада. Добра, што ў нас былі свае святы.

**— Якія?**

— Дзень вяселля, дзень знаёмства... ёсць і яшчэ што адзначыць і што ўспомніць.

АДКРЫВАЕМ АМЕРЫКУ

# СВЯТА БЕЗ ЛАПАТЫ

***Не ведаю на каго крыўдзіцца — ці то на былыя часы, ці то на ўласную памяць, але ўсе нядаўнія святы асацыіруюцца для мяне з бясконцымі суботнікамі. Адзінае чаго хацелася тады, каб на гэтым свяце мне не хапіла лапаты. Але кожны раз прыходзілася са страшэнным грукатам валачыць за сабой гэтую цяжкую жалязяку па брудным вясновым асфальце, усім сваім выглядам даючы зразумець, што ты не прэтэндуеш на ролю сялянкі са скульптуры Мухінай. І заўсёды хацелася іншага свята... Шчырага і без лапат.***

***Яно з'явілася зусім выпадкова. Дакладней яно было, але мы пра гэта не ведалі. І зараз па-мойму недаравальна пазбаўляць сябе шчырага свята толькі таму, што праваслаўная царква ўшаноўвае 14 лютага не святога Валянціна, а святога Трыфана, што каталіцкія — руская, нямецкая, прыбалтыйская з імем гэтага святога свята закаханых таксама не звязваюць. Прытрымліваюцца і рупліва захоўваюць традыцыі гэтага свята англічане і амерыканцы. Але далёка не ўсе зараз памятаюць, чаму яно звязана менавіта з імем святога Валянціна.***

Перагарнуўшы горы літаратуры і старых газет, мы дакапаліся да ісціны. На самой справе св. Валянцінаў, што памерлі ў Старажытным Рыме ў 269 годзе, было два. Дзеянні іх даўно ўжо сталі легендай, і цяпер ніхто дакладна не памятае, якому з іх прысвечана свята. Вядома толькі, што адзін з іх, маладзейшы, быў у Рыме прапаведнікам і ўрачом. У час ганення на хрысціян імператара Клаўдзія ён быў пакараны смерцю. Другі Валянцін — епіскап Цернійскі — жыў непадалёку ад Рыма і загінуў смерцю пакутніка ў тым жа 269 годзе. 14 лютага — дзень памяці іх абодвух. Але чаму гэта ўсё ж такі свята закаханых?

Легендаў і домыслаў наконт гэтага шмат. Усе яны прыгожыя і рамантычныя. Кожная з іх можа быць праўдай.

ВЕРСІЯ ПЕРШАЯ. Чакаючы пакарання смерцю за сваю веру, св. Валянцін напісаў ліст да дачкі наглядчыка і падпісаў яго «Ваш Валянцін».

ВЕРСІЯ ДРУГАЯ. Святы Валянцін цудадзейным чынам вылячыў дачку свайго наглядчыка ад слепаты. Але, нягледзячы на гэты высакародны ўчынак, быў пакараны смерцю.

ВЕРСІЯ ТРЭЦЯЯ. Легенды апісваюць св. Валянціна як лепшага і шчырага сябра малых дзяцей. Калі ж ён апынуўся за кратамі, дзеці пісалі яму маленькія цыдулкі, каб падбадзёрыць і падтрымаць настаўніка і сябра.

ВЕРСІЯ ЧАРЦВЕРТАЯ. У дзень пакарання смерцю св. Валянціна праходзіла традыцыйнае рымскае свята «Люперкалія», у час якога юнакі і дзяўчаты выбіралі сабе жаніхоў і нявест і аб'яўлялі аб заручынах. Калі ж іх намеры не былі настолькі сур'ёзнымі, то пад час святочных оргій кожны мог знайсці сабе проста сябра ці сяброўку.

ВЕРСІЯ ПЯТАЯ. Па рымскім календары новы год прыходзіцца якраз на палову лютага. Магчыма, што пад час навагодніх святаў праводзіліся падобныя на традыцыйныя рускія «святкі» — гаданні на нарачоных. Дзень ушаноўвання св. Валянціна супадае з традыцыяй такіх гаданняў.

ВЕРСІЯ ШОСТАЯ (англійская). Існуе даўняе англійскае павер'е, што 14 лютага, калі прырода робіць паварот да вясны, у птушак пачынаецца перыяд шлюбных гульняў: яны падзяляюцца на парачкі і тым самым пачынаюць «сезон кахання».

Ну вось і ўсё. А зараз выбірайце з гэтых версій тую, якая найбольш вам спадабалася (хаця для святочных тастоў можна выкарыстоўваць усе шэсць), і дарыце сваім каханым гэта свята: шчырае, прыгожае і простае. Дарыце, як гэта робяць у старой добрай Англіі, пацалункі, кветкі і цукеркі, а калі магчыма і такое,— шакаладныя сардэчкі. Будзьце наіўнымі і сентыментальнымі: раз у год можна дазволіць сабе такую раскошу. А галоўнае — шчырымі.

**Вольга УЛЕВІЧ.**

*P. S.* Для слабай паловы паведамляем, па сакрэту, што дзень св. Валянціна лічыцца яшчэ і мужчынскім святам.

ПАДКАЗКА ДЗЯДУЛІ АРЫСТАФАНА

# ПАЛАВІНКА МАЯ, ЯК Я ПА ТАБЕ СУМУЮ

***Рыхтуючы матэрыялы да святочнай паласы, мы разлічвалі: паколькі каханне — рэч сур'ёзная, хтосьці з універсітэцкіх спецыялістаў растлумачыць нам глыбінную філасофскую сутнасць гэтай з'явы. Але... Але хтосьці палічыў сябе не надта дасведчаным у гэтай справе, хтосьці, дзякуючы свайму быламу выхаванню, не адважыўся на размову. І, нічога не зробіш, прыйшлося звярнуцца да старажытных філосафаў, асабіста да дзядулі Арыстафана.***

**— Паважаны спадар Арыстафан, растлумачце нам, калі ласка, што азначае для чалавека каханне?**

— Мне здаецца, людзі наогул не ўсведамляюць сапраўднай магутнасці кахання, бо, калі б яны ўсведамлялі яе, яны б узводзілі ёй найвялікшыя храмы і алтары і прыносілі б ёй найвялікшыя ахвяры... Бо Эрат — самы чалавекалюбівы бог, ён дапамагае людзям і лечыць хваробы... Такім чынам, я паспрабую растлумачыць вам яго моц, а вы будзеце настаўнікамі для іншых.

Калісьці наша прырода была непадобнай на цяперашнюю. Перш за ўсё, людзі былі трохполымі, а не двух, як цяпер,— мужчынскага і жаночага, бо існаваў яшчэ і трэці пол, які аб'ядноўваў у сабе прыкметы гэтых абодвух.

**— Што вы кажаце?! Не можа быць...**

— Акрамя таго, цела ва ўсіх было акруглае, спіна не адрознівалася ад грудзей, рук было чатыры, ног столькі ж, і ў кожнага на круглай шыі — два твары, зусім аднолькавыя, галава ж у двух гэтых твараў, што глядзелі ў процілеглыя бакі, была агульная, вушэй мелася дзве пары, сараматных частак дзве...

**— Во жахі! А як жа такі чалавек рухаўся?**

— Альбо прама, так, як мы цяпер, але любым з двух бакоў наперад, альбо, калі спяшаўся, ішоў колам, падымаючы ногі дагары і перакатваючыся на васьмі канечнасцях, што дазваляла яму хутка бегчы наперад.

Жудасныя ў сваім моцы і магутнасці, яны мелі вялікія задумы і рабілі замах на ўладу багоў. І вось Зеўс і іншыя багі сталі раіцца, як абыйсціся з людзьмі; знішчыць іх, паразіўшы род людскі маланкай, як калісьці гігантаў,— тады багі пазбавяцца ўшаноўвання і дароў ад людзей; але і мірыцца з такім бясчынствам таксама нельга было...

**— І знішчылі?!**

— Зразумела, не. У рэшце рэшт Зеўс, насілу нешта прыдумаўшы, сказаў: «Здаецца я знайшоў спосаб захаваць людзей і пакласці канец іх буянству, паменшыўшы іх моц. Я разрэжу кожнага з іх напалову, і тады яны, па-першае, стануць слабейшымі, а па-другое, больш карыснымі для нас, таму што колькасць іх павялічыцца. А калі яны і пасля гэтага не супакояцца і пачнуць буяніць, я,— сказаў ён,— рассяку іх напалову зноў, і яны заскачуць у мяне на адной ножцы». Сказаўшы гэта, ён пачаў рэзаць людзей напалову...

Такім чынам, кожны з нас — гэта палавіна чалавека, рассечанага на дзве камбалападобныя часткі...

**— І людзі сталі такімі, як мы. Гэта зразумела. Але як яны змаглі прывыкнуць да жыцця ў новай і такой незвычайнай для іх якасці?**

— У тым і справа, што не змаглі. Таму кожны заўсёды шукае палову, якая адпавядае толькі яму. Мужчыны, што ўяўлялі сабой адну з частак той былой двуполай істоты, якая называлася андрагінам, ахвотнікі да жанчын, і распуснікі ў большасці сваёй належаць менавіта да гэтай пароды, а жанчыны такога паходжання ахвочыя да мужчын. Жанчыны ж, што ўяўлялі сабой палову былой жанчыны, да мужчын не вельмі схільныя, іх болей прываблiваюць жанчыны, і лесбіянкі належаць менавіта да гэтай пароды. Затое мужчын, якія складалі палову былога мужчыны, прываблівае ўсё мужчынскае: ужо ў дзяцінстве яны любяць ляжаць у абдымках мужчын.

Калі каму-небудзь здараецца напаткаць якраз сваю палову, абодвух ахоплівае такое дзіўнае пачуццё прыхільнасці, блізасці і кахання, што яны сапраўды не жадаюць развітвацца нават на кароткі час. І людзі, якія праводзяць разам усё жыццё, не могуць нават адказаць, што ўсё ж такі ім патрэбна. Бо нельга ж сцвярджаць, што толькі дзеля задавальнення пажаданасці настолькі ўпарта імкнуцца яны быць разам.

**— І якое тлумачэнне такому імкненню людзей бачыце Вы?**

— Зразумела, што душа кожнага жадае чагосьці іншага. І калі б перад ім паўстаў Гефест са сваімі прыладамі і запытаў: «Людзі, чаго ж вы жадаеце адзін ад аднаго? Можа, вы жадаеце, як мага даўжэй быць разам і днём, і ноччу? Калі ваша жаданне менавіта такое, я гатовы зрасціць вас у адно цэлае. І пакуль вы жывеце, вы будзеце жыць адным агульным жыццём, а калі вы загінеце, у Аідзе будзе адзін нябожчык замест двух, бо напаткае вас агульная смерць. Падумайце толькі, ці гэтага вы жадаеце?..»

**— І калі такое здарыцца на самай справе, людзі адважацца зноў змяніць сваю натуру?**

— Калі здарыцца так, мы ўпэўнены, што кожны палічыў бы, што пачуў менавіта тое, аб чым даўно марыў, апантаны імкненнем зліцца з каханым у адну істоту. Прычына гэтаму тая, што такая была наша першапачатковая прырода і мы складалі адзінае цэлае.

**— Дзякуй Вам вялікі, паважаны спадар Арыстафан, за змястоўную размову. Шчыра кажучы, вы здзівілі нас дасведчанасцю і мудрасцю вашых поглядаў.**

**Распытвала**
**Вольга УЛЕВІЧ.**

●●●

***Аказваецца, старажытныя мудрацы ведалі аб каханні нашмат больш і намнога раней, чым мы. І нават тое, чаго ў нашай краіне доўгі час наогул не было, для іх існавала яшчэ тады. І не толькі існавала, але і было прадметам сур'ёзных даследванняў.***

***Зразумела, сёння над думкамі нашага субяседніка можна пасмяяцца з вышыні сваёй саўковай адукацыі, паздзекавацца з дзядулінай наіўнасці, але можна над чымсьці і задумацца, пазайздросціць цярплівасці і непасрэднай прыгажосці поглядаў старажытных.***

●●●



***Уяўленні аб каханні і гармоніі ў кожнага свае. Але нядрэнна было б пра іх даведацца.***

*«Ідэальная пара — гэта калі людзі глядзяць не адзін на аднаго, а ў адным напрамку. Яшчэ я мяркую, калі людзі кахаюць, гэта заўсёды прыносіць добрыя вынікі: сумеснае выступленне ці цёплы і ўтульны дом — якая розніца?»*

***Наталля БЕСЦЯМЬЯНАВА.***

*«Каханне — цяжкая творчасць. Цярпенне неабходна і духоўная напружанасць. Ніхто ж так балюча не параніць, як адзіны блізкі чалавек».*

***Яўген СЦЯБЛОЎ.***

*«Мне здаецца, што ўзрост не іграе наогул ніякай ролі ў справах сардэчных. Зусім неабавязкова чакаць, калі табе будзе многа гадоў, каб «выспець» для кахання».*

***Поль БЕЛЬМАНДО (сын).***

*«Сакрэт стварэння сямейнай пары — перш за ўсё ў каханні. На самай справе гэта здараецца даволі рэдка, а часцей за каханне прымаюць нешта іншае. Калі ёсць каханне, тады разумееш адно аднаго без слоў, а галоўнае — ёсць жаданне ісці насустрач».*

***Андрэй МАКАРЭВІЧ.***

*«Каб быць шчаслівым у каханні патрэбна быць маладым. А далей ужо трэба думаць, як захаваць усе прыгожыя бакі кахання».*

***Таццяна ДАРОНІНА.***

